◊ Да 22 кастрычніка ў трох галерэях Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — Міжнародная выстаўка "Слова і вобраз", якая дае магчымасць прасачыць і асэнсаваць працэс узаемапранікнення візуальнага і вербальнага мастацтваў. У галерэі "Ракурс" размясцілася стыльная вытанчаная серыя "Альфабэта" (малюнак на паперы, туш, прынт) М. Капілавай — своеасаблівая постмадэрнісцкая "анімацыя" кірыліцы. Дасціпна стылізаваныя сярэднявечныя персанажы — іранічныя, фрывольныя, стомленыя, самотныя, памаўзлівыя, хітраватыя, разззлаваныя, пажадлівыя, рамантычныя, загадкавыя — жывуць у пластычнай повязі з геаметрыяй сваіх літар. На раздарожжы выставачных лабірынтаў гледача сустрэне "Звон" (шамот) Т. Васюк, нібы рытуальны валун з выяваю Крыжа Еўфрасінні, са старажытнымі полацкімі пісьмёнамі. Рой рознакаляро-



вых акрылавых літар і значкоў утварае профіль "Ганна-Марыя" А. Плясанава, а ў графічным аркушы У. Правідохіна з серыі "Кветкі" строгія лініі сухога букета атуленыя мудрымі радкамі У. Хіна: "Ва ўсіх свае вобразы ўзнікаюць, свае кветкі, бо душа не ва ўсіх аднолькавая...". Гэтая неаднолькавасць выяўляецца ў палотнах жывапісцаў — "Славянскія першадрукары" В.Барабанцава, дыптых "Азбука для дарослых" Ф.Ястраба, "Лісты Ван Гога" Д.Сурыновіча (гл. фота), "Тут кніжак болей не чытаюць" (крама-кнігарня ў Чарнобыльскай зоне) В. Ціханава; у фотаздымках А. Жарнасека, В. Калеснікавай, В. Качана... Непаўторныя і работы нашых замежных гасцей: "Логас у вобразе" нямецкага мастака Ульфа Назарэнкі, абстрактныя палотны эстонца Яна Элькена, афорты Галіны Бадзяковай з Украіны, жывапіс Веры Джукіч (Сербія), спалучаны з тэкстам "Няскоранай песні" Добрыцы Эрыч. Сяо Чэнь (Кітай) прапануе некалькі філасофскіх малюнкаў алоўкам ды пяром на паперы. Прыкладам — "Глядзі не толькі ў неба": чарада дрэў, магутныя ствалы якіх аперазаныя іерогліфамі, што пры павярхоўным позірку нагадвае "графіку" звычайных бяроз.

Адкрыць малазнаёмую нам Венесуэлу дапаможа тая ж выстаўка "Слова і вобраз". Постэры фатографаў гэтай краіны знаёмяць з больш як 30-ю яе індзейскімі плямёнамі. Каларытныя партрэты, выявы карт, апісанні этнічных асаблівасцей — можна ўявіць, які агромністы пласт моўных і культурных традыцый прадстаўляе амаль 300-тысячнае індзейскае насельніцтва штатаў Венесуэлы.

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ**

***Фота аўтара***